«Вясна» — экстрэмісцкае фармаванне.
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

Разгон акцыі на Кастрычніцкай плошчы фота дапоўнена

26.03.2017 **Тэгі**: акцыі, свабода мірных сходаў, затрыманні

26 сакавіка на Кастрычніцкую плошчу сталіцы выйшлі людзі, каб выказаць пратэст супраць брутальных затрыманняў у Дзень Волі. Пратэстоўцаў пачалі затрымліваць яшчэ на падыходзе да плошчы.

На станцыі метро Кастрычніцкая затрымалі чатырох студэнтаў. Вядома, што сярод іх ёсць студэнцкі актывіст **Крысціян Шынкевіч**. Напярэдадні ён быў затрыманы разам з назіральнікамі на офісе ПЦ "Вясна" і пасля вызвалення звяртаўся ў шпіталь.


Тым часам на самой Кастрычніцкай плошчы АМАП і міліцыянты ў гукаўзмацняльнік запатрабавалі ад людзей разыйсціся і пагражалі прымяненнем фізічнай сілы.

У 12:15 пачаліся затрыманні.



Затрыманая праваабаронца **Таццяна Рэвяка**. Разам з ёй у аўтазак пасадзілі яшчэ 9 чалавек. Вядомыя наступныя імёны: **Алена Герасіменка, Дзмітрый Жывіцкі**, **Дзмітрый Іванавіч Васільчанка**, **Аляксандр Кудзін**, **Валянцін Карзнікаў**, **Антон Твардоўскі**, **Дзмітрый Кухцін**, **Таццяна Шамчук**. Сярод іх ёсць дакладна адзін непоўнагадовы - **Андрэй Рачок**.

Затрыманых "пакуюць" у аўтазакі, таксама у раёне плошчы стаяць сінія аўтобусы.



Пасля зачысткі плошчы, назіральнікі фіксуюць затрыманні на праспекце на ўваходзе ў метро ля ўніверсама "Цэнтральны" і далей ў напрамку да рэстарана McDonald's. На людзей палююць у дварах дамоў.



АМАП загадаў закрыць уваход на станцыю метро "Кастрычніцкая". Людзі распавядаюць, што бачылі затрыманні і ў раёне Нямігі, там людзей запіхвалі ў аўтобус.



Вядомыя імёны новых затрыманых: кіраўнік Арт-Сядзібы **Павел Белавус** і яго цяжарная жонка **Кацярына Маковіч** (пазней яе адпусцілі), **Мікіта Краснакуцкі**, **Раман Пратасевіч, Стась Карпаў, Аляксандр Ганчаронак** (ці **Ганчарэнка**),маладзечанскі блогер **Руслан Кісялёў**, **Клім Буры, Ляўко, Антон Перавёртаў, Іван Лўтаў.**


З'явілася інфармацыя, што Павел Белавус быз дастаўлены ў Ленінскі РУУС (і верагодна там утрымліваюць і іншых затрыманых), а пазней пераведзены ў ЦІП на Акрэсціна. У ЦІПе таксама знаходзяцца Крысціян Шынкевіч і Мікіта Краснакуцкі.

У Цэнтральным РУУСе, куды была дастаўлена Таццяна Рэвяка, чалавек 20 затрыманых паставілі тварам да сцяны наўпрост у двары. Пазней праваабаронцу, а таксама Алену Герасіменка, Таццяну Шамчук, Руслана Кісялёва і шмат іншых затрыманых вызвалілі.

Опубликовать







Паказваў "Вікторыю" на Маршы. Мужчыну асудзілі да 2,5 гадоў "хатняй хіміі" па "народным" артыкуле

Двух сябровак асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у акцыі пратэсту ў 2020 годзе

Мужа і жонку Каражан асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у акцыі пратэсту

У рэгіёнах Міншчыны праводзяць пікеты ў "падтрымку выбараў". Разбіраемся, што з імі не так


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА


"У мяне не было магчымасці супраціўляцца інакш". Маналогі затрыманых на антываенных акцыях два гады таму

"Турмы ў турме": захаванне правоў зняволеных ў ізалятарах, карцарах і ПКТ — праблемы і выклікі


"У ПК-1 палітвязняў прымушаюць закапваць будаўнічае смецце і спальваць адкіды". Былы вязень указаў месцы на мапе

Запрашаем на канферэнцыю! Штрафны ізалятар, карцар, ПКТ: інструмент выпраўлення ці знявагі?









АПОШНІЯ НАВІНЫ

Больш за 8000 жанчын зазналі палітычны пераслед у Беларусі. Рэпрэсіі ў адносінах да жанчын — у інфаграфіках

Дайджэст вызваленых: мінімум 24 палітвязні ў лютым выйшлі на волю па заканчэнні тэрміну

Палітвязню Алегу Рубцу прызначылі яшчэ паўтара года зняволення

Былая палітзняволеная Алена Дзядзюля: "Я абяцала жанчынам, што буду распавядаць пра іх лёсы паўсюль, дзе магу"

Арышт за "Жыве Беларусь" і забойства расійскімі сілавікамі беларускага актывіста: хроніка пераследу 6-7 сакавіка (дапоўнена)

За Марш асудзілі мужа і жонку: іх затрымалі, калі яны выязджалі з

Беларусі ў госці да дзяцей

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ


Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Люты 2024

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Выбары*2024

ВЫДАННІ





Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА





















СЯБРОЎСТВА







#BYSOL

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

